# ПАРТЫЗАНСКІЯ ФАРМІРАВАННІ НА ТЭРЫТОРЫІ КРЫЧАЎСКАГА РАЁНА МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ ПАДЧАС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (САЦЫЯЛЬНЫ І НАЦЫЯНАЛЬНЫ СКЛАД, КОЛЬКАСЦЬ, ШЛЯХІ ПАПАЎНЕННЯ)

*Л. У. Ляховіч*

Тэма партызанскага руху на Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, здаецца, распрацавана дастаткова падрабязна ў айчыннай гістарыяграфіі. Разам з тым даводзіцца канстатаваць, што з цягам часу ў распараджэнне гісторыкаў з'яўляюцца новыя крыніцы, пэўныя падыходы ўдакладняюцца і пераасэнсоўваюцца. Вялікае значэнне ў гэтым плане мае апублікаванне новых дадзеных у кнігах гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць», аднак нават у гэтым выданні пэўныя аспекты праблемы асвятлення не атрымалі. Так, напрыклад, шырока вядомая дзейнасць партызан, іх колькасць (з пэўнымі удакладненнямі), а таксама назвы партызанскіх фарміраванняў. Аднак такія характарыстыкі, як шляхі папаўнення, узровень адукацыі, узрост, нацыянальнасць, як правіла, застаюцца па-за ўвагай чытача. Сацыяльны партрэт удзельніка партызанскага руху некалькі губляецца на фоне баявой дзейнасці. У прапануемым артыкуле зроблена спроба ў некаторым сэнсе запоўніць гэты прагал, і аналіз партызанскага руху Крычаўшчыны можа даць пэўныя вынікі.

Зразумела, атрыманая інфармацыя можа ўдакладняцца, кожны рэгіён меў мясцовыя асаблівасці. Так, Крычаўскі раён не адносіўся да тэрыторый з вялікай колькасцю партызан (лясоў было няшмат) і знаходзіўся на мяжы з Расіяй, што накладала пэўны адбітак на менталітэт насельніцтва. Тым не менш, калі гаворка ідзе аб канкрэтнай з'яве, кіруемай з адзінага цэнтра, у маштабах адзінай дзяржавы, то атрыманыя дадзеныя могуць быць у значнай ступені перанесеныя і на іншыя раёны Беларусі.

Дакументы сведчаць, што ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці дзейнічалі наступныя партызанскія злучэнні: 3-і асобны атрад (214 чал.), 720-ы асобны атрад (297 чал.), 48-ы асобны Крычаўскі атрад (204 чал.), 48-ы асобны Прапойскі атрад (302 чал.), асобны атрад Ананава (22 чал.), асобны атрад «Анатоля» (32 чал.), асобны атрад «Чапай» (34 чал.), «Чацвертыя», або атрад «Качубей» (24 чал.), асобны атрад «Алеся» (33 чал.), асобны атрад «Валянціна Маёрава» ( 30 чал.), партызанскі атрад «Друпя» (29 чал.), партызанскі полк «Трынаццаць» (2169 чал.) [1, с. 313–318] – усяго 3390 чалавек. Пры гэтым патрэбна мець на ўвазе, што для 8 з 12 названых фарміраванняў колькасны склад указаны на момант злучэння з часткамі Чырвонай Арміі ці выхаду ў тыл, а для 4 – на момант стварэння. Арэал дзейнасці партызанскіх атрадаў быў значна шырэй за межы непасрэдна Крычаўскага раёна – гэта Шклоўскі, Горацкі, Дрыбінскі, Касцюковіцкі, Клічаўскі, Краснапольскі, Чавускі, Прапойскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мсціслаўскі, Круглянскі, Бялынічскі, Клімавічскі, Мсціслаўскі і іншыя раёны, а таксама Смаленская, Мінская, Віцебская, Гродзенская вобласці.

З якіх крыніц фарміраваліся партызанскія атрады? Дадзеныя аб 12 атрадах наступныя: асобны атрад Ананава – з партыйна-савецкага актыву Крычаўскага раёна і групы байцоў Клімавічскага знішчальнага атрада; асобны атрад «Анатоль» – з ваеннаслужачых, якія не выйшлі з акружэння; асобны атрад «Чапай» – з ваеннаслужачых, якія не выйшлі з акружэння; «Чацвертыя», або атрад «Качубей» – са служачых 4-га Упраўлення НКУС СССР, 60 % асабовага складу – пагранічнікі; партызанскі атрад «Друпя» – спецатрад НКДБ БССР. Такім чынам бачна, што па дадзеных у 5 з 12 партызанскіх злучэннях знаходзіліся ваенныя і работнікі органаў дзяржбяспекі і ўнутраных спраў. Гэта зразумела, калі ўлічыць іх дзейнасць – разведку, дыверсіі, работу з агентурай і г. д. Астатнія 7 фарміраванняў ствараліся традыцыйна – гэта значыць людзі, пакінутыя ў зоне акупацыі партыйнымі органамі, фарміравалі вакол сябе групы з надзейных людзей, якія потым пашыраліся. Часта ў партызанскія групы ўваходзілі падпольшчыкі. Так, напрыклад, старшыня атрада № 48 А. Л. Гаўрыленка спачатку ўзначальваў падпольную групу ў г. Крычаве. У ліпені 1941 г. ён быў пакінуты райкомам КПБ для арганізацыі падпольнай барацьбы на акупіраванай тэрыторыі [2, с. 26].

Значны інтарэс для даследчыка прадстаўляе аналіз сацыяльнага складу падобнай партызанскай групы. Для прыкладу можна разгледзець асабісты склад партызанскага атрада № 48.

Усяго – 204 чал., з іх мужчын – 188, жанчын – 16. Па нацыянальнасці: беларусаў – 93, рускіх – 93, украінцаў – 20, палякаў – 1, іншых (сярод якіх упамінаюцца мардвін, грузін і нават француз) – 7 [3, с. 1–16]. Па прафесійнаму складу: калгаснікаў – 59, рабочых – 55, ваеннаслужачых – 19, навучэнцаў – 22, служачых – 27, настаўнікаў – 29, ІТР – 4, урачоў – 1, аграномаў –1, старшынь калгасаў – 1, савецкіх работнікаў – 1, дырэктароў прадпрыемстваў – 1, партработнікаў – 2, работнікаў НКУС і міліцыі – 2. Такім чынам, можна вылучыць пэўныя рысы сацыяльнага партрэта «сярэдняга» партызана на Беларусі: гэта беларус ці рускі, рабочы ці калгаснік, хаця служачыя, настаўнікі і навучэнцы таксама складалі значную частку.

Паводле партыйнага складу сітуацыя выглядае так: беспартыйных – 114, камсамольцаў – 59, членаў ВКП(б) – 15, кандыдатаў у члены ВКП(б) – 16. Як правіла, кіраўнікамі атрадаў як партызан, так і падпольшчыкаў былі камуністы і камсамольцы; падобная колькасць партыйнай праслойкі дазваляе зрабіць пэўныя высновы і аб агульнай ідэйнай падрыхтоўцы ў атрадзе.

Калі прааналізаваць узроставы склад партызанскіх фарміраванняў, то стане відавочна, што ў іх уваходзілі людзі пераважна маладога ўзросту. Так, у атрадзе № 48 з 204 чалавек 102 – людзі ад 26 да 45 гадоў, 85 чалавек – ад 18 да 26 гадоў, 9 чалавек – падлеткі да 18 гадоў, і зусім мала – 8 чалавек – людзей, старэйшых за 45 гадоў. Дадзеныя лічбы лёгка тлумачацца, калі прыняць да ўвагі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ

ўмовы жыцця і працы, тое, што ўсе – людзі цывільных прафесій ці ваеннаслужачыя [1; 3].

Для параўнання можна звярнуць увагу яшчэ на адно партызанскае фарміраванне – атрад «Анатоля» ці «Анатоля-Таіра». Гэты атрад, невялікі па колькасці (32 чал. на дзень арганізацыі), быў створаны з воінаў-акружэнцаў. Атрад не вёў сваёй статыстыкі, нават імя яго кіраўніка Грышына Анатоля з'яўляецца псеўданімам. Аднак вядома, што атрад вёў партызанскую работу самастойна і быў інтэрнацыянальным (сам старшыня атрада быў татарынам, сярод членаў атрада былі украінец, казах, узбек; паводле імёнаў, астатнія маглі быць беларусамі або рускімі). З успамінаў насельніцтва, якое дапамагала атраду, усе члены атрада былі людзі маладыя (19–30 гадоў) [4, с. 6–9]. Адзначаная інфармацыя падцвярджае вылучаныя раней рысы сацыяльнага партрэта партызана.

Пры вывучэнні партызанскага руху ў школе і пры выкладанні ў вышэйшых навучальных установах чамусьці выпрацаваўся пэўны стэрэатып – рабіць акцэнт, па-першае, на колькасныя паказчыкі (колькасць партызан, праведзеных імі дыверсій і баявых аперацый, захопленай жывой сілы ворага, знішчаных эшалонаў і г. д.), па-другое, менавіта на самой баявой дзейнасць. Між тым, пры такім разглядзе пачынае губляцца сацыяльнае аблічча партызан, яны робяцца нейкай агульнай масай (тое, што вучні ці студэнты ведаюць некалькі прозвішчаў, справы прынцыпова не мяняе). Патрэбна больш шырэй разглядаць партызанскі рух з пункту гледжання сацыяльнай стратыфікацыі. Гэта і канкрэтызуе нашы веды, і наблізіць усіх, хто вывучае дадзеную праблему, да аб'екта вывучэння.

*Крыніцы і літаратура.*

1. Памяць : гіст.-дак. хроніка Крычаўскага раёна. Маладзечна, 2004.
2. НА РБ (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь), ф. 1394, воп. 1, спр. 23.
3. НА РБ, ф. 4332, воп. 1, спр. 1.
4. НА РБ, ф. 4955, воп. 1, спр. 1.

## МЕСТО КОНКУРСА В СИСТЕМЕ ПАТРИОТИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ МОЛОДЕЖИ

***Ж. Б. Манкевич***

Средства массовой информации повсеместно отмечают, что ни в одной из стран бывшего СССР не уделяется столько внимания ветеранам в связи с приближающейся юбилейной датой – 60-летием Великой Победы. Тех немногих, оставшихся в живых героев приглашают выступить по телевидению, поделиться воспоминаниями с современниками в интервью журналов и газет. С неподдельным интересом слушают их рассказы школьники и студенты.

Большой вклад в дело патриотического воспитания молодежи внес V Республиканский конкурс «Великая Отечественная война в исторической

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ